# ?????????? ???????? : ?????? ?і ??????

**Description**

**Існуе меркаванне, што старыя вёскі на Беларусі зыходзяць у небыццё. Ці сапраўды так? У траўні 2014 году спыніўся я каля маленькай вёсачкі – Лысая Слабада – Гарэцкага раёну Магілёўскай вобласці, у якой пражывае 20 чалавек, і зазірнуў праз нахіленыя платы.**



1. Крамы тут няма, таму вяскоўцы купляюць штодзённыя спажывецкія тавары ў харчовым фургоне, які прыязджае два разы на тыдзень. Часам сюды прывозяць пратэрмінаваныя прадукты, якія выклікаюць харчовае атручванне ў мясцовых жыхароў, і яны – калі выжываюць – ідуць скардзіцца да старшыні калгаса. І працягваюць купляць ежу з харчовага фургону.

2. 80-гадовы Марфон служыў у якасці машыннага аператара ў Казахстане ў 1960-х гадах, і цяпер ён вядомы на ўсю вёску як самы здаровы чалавек. Ягоны эліксір маладосці? Ён не спажывае мяса і праводзіць свае дні, збіраючы грыбы ў мясцовых лясах, альбо курыць тытунь, загорнуты ў газету, у той час, калі ягоныя нашчадкі глядзяць спадарожнікавае тэлебачанне.

3. Маладая маці больш не змушаная вазіць каляску, бо яе дзеткі водзяць уласны невялічкі электрычны аўтамабіль па дарозе, якая была пабудаваная пасля таго, як адна пажылая жанчына напісала асабісты ліст да беларускага прэзідэнта 10 гадоў назад, тым самы пачынаючы адраджэнне сваёй вёскі.

4. Ігар – фермер новага пакалення, які валодае двума конямі, некалькімі дзесяткамі гусей і курэй, парай свіней і вялікім ячменным полем. У гэтым годзе ён плануе купіць новую пральную машыну-аўтамат.

5. Калодзеж пры галойнай дарозе і да гэтай пары з’яўляецца любімым месцам сустрэч сельскіх жыхароў, каб заставацца ў курсе апошніх плётак.



6. Вольга – самая старэйшая жыхарка вёскі. Яе сын, марскі афіцэр, трагічна загінуў яшчэ ў тую пару, калі насельніцтва вёскі было больш за сто чалавек, а скот налічваў да 30 галоў. Цяпер яе гаспадарка скарацілася да саду з агароднінай, дзе яна вырошчвае арганічную зяляніну для сябе, дзяцей і ўнукаў, якія наведваюць яе з Санкт-Пецярбурга.



7. На святкаванне Радаўніцы, праваслаўнага дня памёршых, сельскія жыхары разам з гарадскімі сваякамі наладжваюць невялічкія святы на могілках продкаў, дзе яны напіваюцца ды вядуць гутаркі пра сямейны бізнэс, дзіцячыя ўспаміны і, канешне, рабалку.

**Пераклад на беларускую мову:** Аляксандра Сахар
**Спасылка на арыгінальную версію на англійскай мове.**

**Фота:** Марыя і Віктар.

* Антраполаг і фатограф, які жыве і працуе паміж В’етнамам, Беларуссю і Расіяй.
Cf. www.flickr.com/photos/75976051@N08/

**date créée**
19/06/2014
**Champs de Méta**
**Auteur-article :** Алішэр ШАРЫПАЎ*